

# Урок 36

Начарці квадрат плошчай 1 $дм^2$. Колькі квадратных сантыметраў змяшчаецца ўздоўж адной стараны гэтага квадрата? Колькі такіх радоў?



У адным квадратным дэцыметры дзесяць дзясяткаў квадратных сантыметраў, або адна сотня квадратных сантыметраў.

**$1\ дм^2 = 100\ см^2$**

Колькі квадратных дэцыметраў змяшчаецца ўздоўж адной стараны квадрата плошчай 1 $м^2$? Колькі такіх радоў?

У адным квадратным метры дзесяць дзясяткаў квадратных дэцыметраў, або адна сотня квадратных дэцыметраў.

**$1\ м^2 = 100\ дм^2$**

**1.** Выразі ў квадратных сантыметрах: 7 $дм^2$; 4 $дм^2$; 18 $дм^2$; 260 $дм^2$; 321 $дм^2$.

7 $дм^2$ — гэта сем соцень квадратных сантыметраў, або 700 $см^2$.

$7\ дм^2 = 700\ см^2$



**2.** Выразі ў квадратных дэцыметрах: 4 $м^2$; 7 $м^2$; 61 $м^2$; 300 $м^2$; 660 $м^2$.

4 $м^2$ — гэта чатыры сотні квадратных дэцыметраў, або 400 $дм^2$.

$4\ м^2 = 400\ дм^2$





Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 36



**3.** Састаў выразы. Знайдзі іх значэнні.

| | | | |
|---|---|---|---|
| Дзялімае | 356 + 298 | 128 · 6 | 1000 – 28 |
| Дзельнік | 701 – 699 | 311 – 309 | 592 + 169 – 755 |

**4.** Растлумач, што абазначаюць выразы.
Кастусь ішоў 8 мін са скорасцю $a$ м/мін. Потым ён павялічыў скорасць на 10 м/мін і ішоў яшчэ 5 мін.

$a \cdot 8$ $\qquad$ $a + 10$ $\qquad$ $(a + 10) \cdot 5$

**5.** Трэба вымыць 8500 $м^2$ плошчы вокнаў гандлёвага цэнтра. У першы дзень мыйшчыкі вокнаў вымылі пятую частку ўсёй плошчы, а ў другі дзень — 1100 $м^2$. Колькі квадратных метраў плошчы вокнаў засталося вымыць?

Як змяніць лікавыя даныя ва ўмове задачы, каб адказ стаў меншым?



? Колькі квадратных сантыметраў змяшчаецца ў адным квадратным дэцыметры?
Колькі квадратных дэцыметраў змяшчаецца ў адным квадратным метры?

**1.** Устаў прапушчаныя лікі.

6 $м^2$ = ? $дм^2$ $\qquad$ 18 $дм^2$ = ? $см^2$ $\qquad$ ? $дм^2$ = 24 $м^2$
6 $дм^2$ = ? $см^2$ $\qquad$ 18 $м^2$ = ? $дм^2$ $\qquad$ ? $см^2$ = 24 $дм^2$

**2.** Для вырабу васьмі пар аднолькавага абутку неабходна 32 $дм^2$ скуры. Колькі квадратных дэцыметраў скуры спатрэбіцца, калі трэба пашыць у 2 разы менш пар такога абутку?



Правообладатель Национальный институт образования